УДК 808.82(476)

**У. Л. Аляксандраў**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

# СКЛАДНІКІ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСТВА: ПРАБЛЕМЫ І МАГЧЫМАСЦІ

Кожнае грамадства неаднароднае, але ў той жа час, паколькі і пакуль яно ўяўляе сабой пэўную цэласнасць, грамадства ёсць сукупнасць агульных рысаў. Атаясамліванне асобным чалавекам сябе з гэтымі рысамі (часткова ці цалкам) назавём ідэнтычнасцю.

У дадзеных тэзісах сцісла разгледзім некалькі пытанняў: 1) што можна лічыць беларускай ідэнтычнасцю; 2) з якіх абшараў (сфераў) складаецца ідэнтычнасць грамадства; 3) якія асноўныя аб'екты яе фарміравання, а таксама сродкі і інструменты.

Беларуская ідэнтычнасць — гэта адчуванне і ўсведамленне сябе беларусам. За гэтым нібы трывіяльным сцвярджэннем хаваецца нямала палітычных, культурных і нават лінгвістычных праблем. Дзеячы нацыянальнага адраджэння розных перыядаў нашай гісторыі прыклалі безліч высілкаў, каб праз творы мастацтва і паўстанні, навуковыя працы і дзяржаўнае будаўніцтва давесці да беларусаў, што яны беларусы. Сёння Рэспубліка Беларусь як самастойная, суверэнная дзяржава адбылася. Але наколькі гэта трывала, незваротна? Гэта залежыць як ад знешніх (геапалітычных у першую чаргу), так і ўнутраных (эканамічных, культурных і інш.) фактараў. Сярод апошніх выключную ролю адыгрывае сацыяльна-псіхалагічны працэс атаясамлівання індывідам сябе з беларускім народам. Гэты працэс можа ісці ў розных вымярэннях, якія мы і назавём складнікамі ідэнтычнасці: этнічны, геаграфічны, гістарычны, палітычны, прававы, эканамічны, культурны, моўны, рэлігійны. Разгледзім некаторыя з іх.

*Этнічны складнік.* Не ўдаваючыся ў развагі пра тое, якую складаную эвалюцыю прайшлі паняцці «этнас», «народ», «нацыя», адзначым важнасць укаранення ў масавую свядомасць (сродкамі адукацыі, масавай інфармацыі) паняцця грамадзянскай нацыі, паводле якога народ у сучасным свеце — гэта не толькі антрапалагічна-біялагічнае ўтварэнне, а ў першую чаргу палітычнае, прававое, культурнае. Іншымі словамі, беларус — гэта грамадзянін Беларусі незалежна ад свайго этнічнага паходжання. Нездарма да сапраўдных беларусаў мы адносім (і яны самі сябе, паводле сведчанняў) выбітных нашых спартсменаў — хакеіста А. Мезіна, біятланістку Д. Домрачаву, фрыстайлістаў А. Кушніра і А. Цупер, людзей расійскага і ўкраінскага паходжання. Сваімі спартыўнымі дасягненнямі яны праслаўляюць нашу краіну ў свеце ці не больш за многіх палітыкаў і дыпламатаў, даюць магчымасць суайчыннікам ганарыцца Радзімай. На такіх і падобных прыкладах можна лёгка давесці, што беларус — гэта не абавязкова нацыянальнасць з графы савецкіх пашпартоў, а паняцце больш шырокае і сучаснае. У той жа час гэта не выключае цікавасці да сваіх каранёў, радаводу, магілаў продкаў. Адзін складнік не адмяняе і не замяняе іншы. У пэўны момант асабістага ці грамадскага жыцця кожны з іх можа адыграць сваю адметную, нават вырашальную ролю.

*Геаграфічны складнік.* Нездарма часам кажуць, што гісторыя — гэта перш за ўсё геаграфія. Чым ёсць наша геаграфія сёння? Гэта не толькі адпаведныя падручнікі сярэдняй школы. Гэта выгаднае геапалітычнае становішча Беларусі на карце Еўропы, агульнапрызнаныя межы з адсутнасцю тэрытарыяльных спрэчак і прэтэнзій, найпрыгажэйшыя краявіды, апетыя нашымі паэтамі і мастакамі, любоў да сваёй малой радзімы — мястэчка, вёскі, вуліцы. У гэтым сэнсе ўнёскам у фарміраванне беларускай ідэнтычнасці будзе турыстычны паход і экскурсійная вандроўка, чытанне ці складанне патрыятычнага або лірычнага верша, добры фотаздымак ці малюнак беларускай прыроды, рамонт бабулінай хаты ці ўдзел у археалагічных раскопках, рэстаўрацыйных працах.

*Гістарычны складнік.* Гісторыя — таямнічае, загадкавае ўтварэнне грамадскай памяці і мыслення, тое, чаго ўжо няма (а можа і не было), уплывае на тое, што ёсць і што будзе. Гэты складнік адносна Беларусі — адзін з самых цяжкіх, праблемных, супярэчлівых. Доўгае перабыванне беларускага народа ў розных дзяржаўных утварэннях (СССР, Расійскай імперыі, Рэчы Паспалітай) не магло не адбіцца драматычным чынам на гістарычнай свядомасці, нацыянальнай памяці. Калі казаць шчыра, у нас і блізка няма нацыянальнага кансэнсусу адносна галоўных этапаў нашага гістарычнага развіцця, адносна ключавых падзей, асоб, працэсаў нашага мінулага. Тое, што несумненна для адных, сумнеўна для другіх і катэгарычна аспрэчваецца трэцімі. Па кожнаму з перыядаў беларускай гісторыі напісана шмат кніг, артыкулаў, знята многа перадач і фільмаў, але розныя, нават супрацьлеглыя трактоўкі часам абвастраюць старыя спрэчкі. Нават нацыяльныя і дзяржаўныя сімвалы — тое, што ў першую чаргу павінна яднаць народ на эстэтычным, пачуццёва-эмацыянальным узроўні, — нярэдка выступаюць прадметам размежавання, канфліктаў. Адна з галоўных задач нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва — прыйсці да згоды ў гэтым пытанні. Узгадаем, што і славутыя дзеячы нашага нацыянальнага пантэону — Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына — не так даўно ацэньваліся ў беларускай савецкай гістарыяграфіі як «рэлігійныя цемрашалы перыяду феадалізму».

© Аляксандраў У. Л., 2018

*Палітычны складнік.* Хаця палітыка ёсць перш за ўсё барацьба за ўладу і, як і ўсялякая барацьба, у значнай ступені раз'ядноўвае людзей, разводзіць іх па розных партыйных і ідэалагічных лагерах, можна прывесці і шмат прыкладаў станоўчай ролі палітыкі ва ўмацаванні грамадскай еднасці. Дастаткова ўзгадаць нядаўнія (верасень 2014 г. і люты 2015 г.) Мінскія перамовы адносна ўкраінскага канфлікту, у якіх Беларусь сапраўды апынулася ў цэнтры сусветнай палітыкі і дыпламатыі. Нягледзячы на драматычную прычыну саміх перамоў, мы маглі ганарыцца, што наша дзяржава, дзякуючы ўзважанай, міралюбівай, шматвектарнай знешняй палітыцы, змагла стаць пляцоўкай для іх правядзення і заключэння аднайменных пагадненняў.

*Эканамічны складнік.* Кожны народ ганарыцца сваімі сусветна вядомымі брэндамі, прадуктамі вытворчасці найвышэйшага гатунку, эксклюзіўнымі таварамі і паслугамі. Ці шмат у нас такіх? Будзем шчырымі: значна меней, чым хацелася б. Але такі спіс ёсць, ён немалы, і агульнанацыянальная (а не толькі ўрадавая) задача — яго пашыраць. Напрыклад, беларускія IT-спецыялісты ўжо занялі пачэсную нішу на сусветным рынку праграмнага зябеспячэння (узгадаем хаця б звышпапулярнасць камп'ютарнай гульні «Танкі»). Калі, знаходзячыся за мяжой, ты бачыш беларускі тралейбус, трактар ці самазвал, сэрца міжволі поўніцца гонарам, што ты — беларус. І наадварот, за «адмоўныя адметнасці», напрыклад, рэкордныя ў Еўропе паказчыкі інфляцыі, дэвальвацыі нацыянальнай валюты, становіцца сорамна і балюча. Але і гэты боль — своеасаблівае перажыванне ідэнтычнасці: «так не павінна быць, мы вартыя лепшага!».

*Культурны складнік.* У час панавання масавай культуры ўсё цяжэй становіцца не проста ствараць, а нават успрымаць, асэнсоўваць прадукты культуры нацыянальнай. Многае з яе здабыткаў у сучасным дынамічным глабалізаваным свеце здаецца архаічным, прымітыўным, нецікавым. Але ўзгадаем трэці закон гегелеўскай дыялектыкі: лепшае старое, адрынутае і адмоўленае, вяртаецца да нас у іншым абліччы, на новай ступені духоўнага і сацыяльнага развіцця. Паступова і ў нас вяртаецца цікавасць да беларускіх песняў і танцаў, пройдзеныя ў школе «класікі» беларускай літаратуры набываюць актуальнае, надзённае гучанне, гарадское насельніцтва звяртаецца да вясковых звычаяў і абрадаў, сярод моладзевых гурткоў не апошнія па папулярнасці — рыцарскія клубы. Усё гэта таксама працуе на ўмацаванне ідэнтычнасці.

*Рэлігійны складнік.* Роля яго істотна змянялася ў розныя часы. У Беларусі пасля 1970-х гадоў пабудовы ваяўніча-атэістычнага грамадства, назіраецца рэлігійны рэнесанс: усё больш людзей звяртаюцца да веры продкаў або выбіраюць канфесію адпаведна сваім прынцыпам і ідэалам. У той жа час Беларусь паводле канстытуцыі — свецкая дзяржава з дакладнай дэмаркацыйнай лініяй паміж царквой і палітычна-прававымі інстытутамі. Магчымасць спавядаць любую не забароненую законам рэлігію або не спавядаць ніякай з'яўляецца добрым працягам і спадчынай славутай беларускай талерантнасці. Добра, што традыцыі верацярпімасці нам удалося захаваць. Гэты беларускі здабытак выглядае яшчэ больш каштоўным на фоне шматлікіх канфліктаў і войн на рэлігійнай глебе ў мінулым і ў сучасным свеце. Так, і ў нас мяняліся суадносіны розных канфесій: былі часы панавання ўніяцтва, каталіцызму. Сёння, паводле перапісаў насельніцтва і сацыялагічных апытанняў, большасць вернікаў — праваслаўныя. Але міжканфесійны мір і спакой адчуваюць і падтрымліваюць тыя ж каталікі, пратэстанты, мусульмане, іўдзеі. Зацятыя рэлігійныя канфлікты ў свеце паказваюць, што мір у гэтай галіне вельмі крохкі і падтрымліваць яго трэба ўсім і ўсімі намаганнямі.

Але ж якой можна бачыць ідэнтычнасць беларускага грамадства на гэтай глебе? Праваслаўе? Не. Хрысціянства ў цэлым? Таксама не. Можна сказаць, што якраз лепшыя рысы беларускага нацыянальнага характару дазваляюць інтуітыўна падзяляць тыя маральныя нормы і рэлігійныя запаведзі, якія ўласцівыя для ўсіх традыцыйных канфесій, не засяроджваючыся на дагматычных рознагалоссях, рытуальна-абрадавых адрозненнях. Кожны спавядае сваё і па-свойму, але без варожасці да іншага, непадобнага. Гэта і ёсць вяршыня рэлігійнай талерантнасці. Адзін з сімвалаў гэтага ў Беларусі — падвойнае адзначэнне ў дзяржаўным календары Нараджэння Хрыстова і Вялікадня. Тое, што выглядала б камічнай недарэчнасцю ці нагодай для сварак у іншых культурах, у нас з'яўляецца прыкладам і ўзорам рэлігійнага міру. Як слушна заўважае беларускі філосаф В. Евароўскі, «усе гэтыя культурныя супярэчнасці, стала канфліктуючы паміж сабой, тым не менш амаль не ўплываюць на стабільнасць агульнага быцця настолькі супярэчлівага соцыуму» [1, с. 395].

*Моўны складнік.* Калі для многіх народаў ён выглядае аўтаматычным, банальна-відавочным сродкам не толькі камунікацыі, але і ідэнтыфікацыі, то ў нас, наадварот, ён стаў ці не праблемай № 1 у пытанні пра беларускую ідэнтычнасць. Трэба быць шчырымі. Стагоддзі паланізацыі і русіфікацыі не маглі прывесці да іншага выніку. Калі што і здзіўляе, то не тое, што пераважная большасць грамадзян не гаворыць па-беларуску, а тое, што беларуская мова не знікла канчаткова на гэтых абшарах (дзякуючы перш за ўсё беларускім пісьменнікам, настаўнікам, журналістам). Каб не засталося беларускай літаратуры, каб не было адпаведнага прадмета ў школах, а таксама беларускамоўнага радыё і тэлебачання, к канцу савецкай эпохі беларуская мова верагодна ператварылася б у мёртвую, бо рэальных носьбітаў яе ў Мінску і іншых гарадах заставаліся ў літаральным сэнсе адзінкі (тут пакінем убаку складанае пытанне пра гістарычную ролю так званай трасянкі). Зараз стан беларускай мовы, з аднаго боку, лепшы, чым у познесавецкія гады (ужо нярэдка можна пачуць яе ў грамадскіх месцах, яна паступова ахоплівае прастору аб'яваў і шыльдаў), з іншага, новае маладое пакаленне прызнаецца, што часта многае не разумее па-беларуску (не гаворачы ўжо пра спробы размаўляць). Нягледзячы на юрыдычна замацаваную роўнасць дзвюх дзяржаўных моваў, трэба прызнаць, што рэальная прапорцыя ўжывання, а таксама магчымасцяў выкарыстання ў зносінах, у тым ліку у навучанні і працы, у нас далёка не 50 на 50. Чаго варты той факт, што ў Беларусі няма ніводай установы вышэйшай адукацыі з цалкам беларускамоўным навучаннем. Неабгрунтаванымі выглядаюць спасылкі на тэрміналагіч-

ныя складанасці, адсутнасць падручнікаў і дапаможнікаў, недахоп спецыялістаў і выкладчыкаў. Калі б была дзяржаўная воля рухацца ў гэтым кірунку (падтрымка, агітацыя, прававое зябеспячэнне, фінансаванне), за амаль чвэрць стагоддзя, прамінулых з часу распаду СССР, гэта праблема была б вырашана.

А пакуль яе рашэнне застаецца задачай на бліжэйшую і аддаленую будучыню.

Пры гэтым адзначым, што беларуская нацыянальная і моўная талерантнасць выключае нейкую дыскрымінацыю рускай, польскай ці іншых моў. Сур'ёзных сацыяльных канфліктаў на гэтай глебе не назіралася і, упэўнены, не будзе.

Што можна лічыць аб'ектам фарміравання беларускай ідэнтычнасці? Грамадскую псіхалогію і грамадскую актыўнасць (паводзіны і дзейнасць) людзей, што з яе вынікае.

Грамадская псіхалогія не з'яўляецца арыфметычнай сумай псіхічных працэсаў і ўласцівасцяў асобных індывідаў. Статыстычна яна ўяўляе сабой дамінуючыя, пануючыя ў пэўнай сацыяльнай прасторы ўспрыманні, уяўленні і іншыя псіхічныя працэсы (напрыклад, уздым патрыятызму падчас справядлівай вайны, разгубленасць і роспач падчас сацыяльна-эканамічных крызісаў і інш.). Паколькі фенаменалагічна структура грамадскай свядомасці адпавядае свядомасці індывідуальнай, мы можам вылучыць яе складнікі: нацыянальнае (грамадскае) адчуванне, успрыманне, уяўленне, памяць, увага, мысленне, эмоцыі і пачуцці; нацыянальны тэмперамент, характар, воля, здольнасці; нацыянальныя патрэбнасці, каштоўнасці, інтарэсы, ідэалы, перакананні, прынцыпы, вераванні.

Задача дзяржавы і грамадзянскай супольнасці — спрыяць напаўненню гэтых паняццяў адпаведным зместам. Перадумовамі гэтага працэсу выступаюць:

1) агульнаграмадская згода адносна галоўных нацыянальных каштоўнасцяў і інтарэсаў (ці хаця б адсутнасць глыбіннага расколу па палітычных, рэлігійных, культурных, геаграфічных і іншых лініях падзелу грамадства; узгадаем для кантрасту трагедыю нашай братняй паўднёвай краіны);

2) эфектыўная дзейнасць галоўных сацыяльных інстытутаў з выкарыстаннем адпаведных сродкаў і інструментаў. Сярод іх у першую чаргу вылучым: а) інстытуты выхавання і адукацыі (сям'ю, навучальныя ўстановы, гурткі); б) установы культуры (музеі, тэатры, бібліятэкі); в) сродкі масавай інфармацыі і камунікацыі (тэлебачанне, радыё, друк, Інтэрнэт); г) палітычныя і прававыя інстытуты; д) інстытуты адпачынку і вольнага часу (спорт, эстрада, турфірмы і інш.); е) эканамічныя інстытуты (па ўсім ланцугу «вытворчасць—гандаль—спажыванне»).

Пералік складнікаў ідэнтычнасці беларускага грамадства не перашкаджае ўсведамляць, што значную частку жыцця чалавека падзеі вакол яго вымагаюць не агульнаграмадскай (нацыянальна-грамадзянскай), а іншых ідэнтыфікацый: прафесіянальнай, гендарнай, сямейнай, партыйнай і інш. Гэта непазбежна і гэта натуральна. Купляючы беларускі тавар у краме, чалавек гэта робіць перш за ўсё як спажывец, як член сям'і, а не як беларус. Вырабляючы прадукт на прадпрыемстве, ён выступае ў першую чаргу як працаўнік, прафесіянал, той жа здабытчык сродкаў для сям'і, а не як патрыёт Радзімы. Але калі гэты апошні чыннік прысутнічае нават фонам, неўпрыкмет, напаўсвядома — гэта ўжо маленькая цаглінка ў сцены беларускага дома, які мы будуем разам. І калі з такіх цаглінак наш дом паўстане трывалым, надзейным, то ў патэнцыяльна вырашальныя моманты менавіта нацыянальна-грамадзянская ідэнтычнасць выступіць псіхалагічным ядром рашучай дзейнасці народа па ахове сваёй незалежнасці і свабоды. Наша гісторыя сведчыла пра тое шмат разоў.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Евароўскі, В. Б.* Нацыянальная філасофія Беларусі: тэорыя, археалогія, гісторыя, генеалогія, школа / В. Б. Евароўскі ; навук. рэд. Л. Ф. Яўменаў. — Мінск : Беларус. навука, 2014. — 559 с.

УДК 323.1(476)+94(476)"1929/1939"

**М. К. Альховік**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт», Мінск*

## ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ ВА ЎМОВАХ САВЕЦКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ 1929—1939 ГАДОЎ У БССР

Праблемы нацыянальнай дзяржаўнасці і ідэнтычнасці займалі асаблівае месца ў праграме бальшавіцкай партыі. УКП(б) разглядала нацыянальнае пытанне як вытворнае ад класавага і звязвала яго вырашэнне з зацвярджэннем дыктатуры пралетарыяту, ліквідацыяй нацыянальных прывілеяў і абмежаванняў, забеспячэннем нацыянальнага раўнапраўя, права нацый на самавызначэнне, выраўноўваннем узроўняў сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця «нацыянальных ускраін» і цэнтральных губерняў. Пад нацыяй разумелася агульнасць людзей, якая гістарычна склалася і валодала агульнасцю мовы, тэрыторыі, эканамічнага жыцця, псіхічнага складу, культуры [1, с. 6—8]. «Эксплуататарскія элементы» падлягалі

© Альховік М. К., 2018